## ДЫСЦЫПЛІНЫ ПРАФЕСІЙНА-МЕТАДЫЧНАГА МОДУЛЯ Ў СІСТЭМЕ СУЧАСНАЙ ФІЛАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

*С.В. Мартынкевіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Асноўнай тэндэнцыяй развіцця адукацыі ў свеце з'яўляецца "арыентацыя на асобу з мэтай найбольш поўнага раскрыцця яе здольнасцей і задавальнення яе адукацыйнвых патрэб [1, 1]. Сучасныя стандарты вышэйшай адукацыі скіраваны на рэалізацыю камптэнтнаснага падыходу, пры якім нарматыўна-праграмная дакументацыя арыентуе на практыка-арыентаваны ўзровень педагагічнага ўзаемадзеяння. Модульны падыход да праектавання вучэбных праграм дазваляе скарэктаваць траекторыю зместу адукацыі, вылучыць актуальныя тэарэтычныя блокі і звязаныя з імі практычныя тэмы, на аснове якіх адбываецца фарміраванне акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый. Актуальнасць даследавання заключаецца ў выяўленні ўмоў і падыходаў да распрацоўкі і структуравання зместу моўнай адукацыі ў кантэксце практыка-арыентаванай скіраванасці сучасных адукацыйных стандартаў.

Мэта артыкула – разгледзець асаблівасці распрацоўкі зместу практыка-арыентаваных дысцыплін філалагічных спецыяльнасцей на прыкладзе вучэбнага курса "Маўленчае ўзаемадзеянне і камунікатыўныя стратэгіі".

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла вучэбна-праграмная дакументацыя (адукацыйны стандарт, вучэбны план спецыяльнасці 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), вучэбныя праграмы). Метады даследавання – аналітычны, апісальны, вывучэнне і апрацоўка педагагічнага вопыту і вынікаў вучэбнай дзейнасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Маўленне – адна з галоўных састаўных частак прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў, якія павінны дасканала валодаць рознымі відамі маўленчай дзейнасці, прыёмамі маўленчага ўзаемадзеяння, камунікатыўнымі навыкамі. Прымаючы пад увагу, што беларускамоўная камунікацыя паслаблена ў сучасным грамадстве, вучэбны працэс павінен улічваць сувязі сучасных тэхналогій удасканалення міжасобаснай камунікацыі і рэальнай маўленчай практыкі [2], узмацняць камунікатыўна-практычны кірунак пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне адукацыі і літаратурна-рэдакцыйнай дзейнасці.

Вучэбная дысцыпліна "Маўленчае ўзаемадзеянне і камунікатыўныя стратэгіі" ўваходзіць у пералік дысцыплін прафесійна-метадычнага модуля кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі цыкла спецыяльных дысцыплін вучэбнага плана. Мэтай выкладання дысцыпліны вызначана перш за ўсё пазнаёміць студэнтаў з сучаснымі падыходамі да распрацоўкі праблем маўленчай камунікацыі; паглыбіць і сістэматызаваць веды пра спецыфіку камунікатыўнага ўзаемадзеяння і маўленчага ўздзеяння; сфарміраваць уяўленне аб механізмах маўленчага ўздзеяння і маніпулявання, навучыць выкарыстоўваць дадзеныя механізмы ў камунікатыўных сітуацыях; развіваць агульную камунікатыўную культуру. У працэсе вывучэння курса студэнты засвойваюць паняційна-тэрміналагічную базу дысцыпліны; авалодваюць методыкай кагнітыўнай-прагматычнага аналізу камунікатыўных сітуацый, стратэгічнага планавання маўленчага ўзаемадзеяння і тактычнай рэалізацыі камунікатыўнай мэты, стратэгіямі і тактыкамі карэктных маўленчых паводзін. Важна, каб моўныя ўменні студэнтаў трансфармаваліся ў прыёмы выкарыстання мовы для перадачы каштоўнай для адрасанта прагматычнай інфармацыі, пашыраліся іх псіхалагічныя і этычныя ўменні, неабходныя для эфектыўнага маўленчага ўзаемадзеяння ў прафесійнай сферы. У выніку тэарэтычны змест накіраваны на фарміравання найбольш значымых для практычнай дзейнасці ўменняў ужываць атрыманыя веды і асвоеныя аперацыйныя комплексы ў новых камунікатыўных умовах; аналізаваць камунікатыўную сітуацыю ў кагнітыўнай-прагматычным аспекце; ацэньваць ход і вынікі маўленчага ўзаемадзеяння; вызначаць эфектыўнасць тактык, улічваючы фактар адрасата і вар'іраванне камунікатыўных параметраў.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны "Маўленчае ўзаемадзеянне і камунікатыўныя стратэгіі" пакладзены прынцып модульнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на самастойныя модулі (раздзелы). Пры засваенні зместу кожнага вучэбнага модуля ў адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі па фарміраванні

ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкарыстоўваюцца як традыцыйныя, так і інавацыйныя педагагічныя тэхналогіі, у тым ліку тэхналогіі вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, гульнявыя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання, якія садзейнічаюць уключэнню студэнтаў у працэс атрымання ведаў, дазваляюць атрымаць вопыт самастойнага вырашэння разнастайных вучэбных і даследчых задач. Шмат увагі ўдзяляецца працы ў віртуальным адукацыйным асяроддзі. Рашэнне лінгвакамунікатыўных задач эўрыстычнага характару на падставе засвоенага матэрыялу, выкананне творчых практыкаванняў, распрацоўка гульнявых сітуацый, якія патрабуюць ведання нормамі маўленчых паодзін, прыёмамі маўленчага маніпулявання і інш., непасрэдна накіраваныя на авалоданне прыёмамі ўздзеяння на ўдзельнікаў зносін для прыняцця кампетэнтных камунікатыўных рашэнняў; тактыкамі рацыянальнага забеспячэння сваіх інтарэсаў і дасягнення эфектыўнага супрацоўніцтва.

Напрыклад, развіццё практычных камунікатыўных уменняў, звязаных з ужываннем розных псіхалінгвістычных тэхналогій, адбываецца разам з авалоданнем прыёмамі ўздзеяння на адрасата як адкрытага, так і маніпулятыўныя характару. Тэма “Маўленчае маніпуляванне як від маніпулятыўнага ўздзеяння” ўключае такія пытанні для разгляду, як: “Маніпуляцыя: азначэнне паняцця і яго маральны бок. Пазіцыя адрасата і адрасанта. Віды маніпулятыўная ўздзеяння. Маніпуляцыя вобразамі. Аперацыйна-прадметная маніпуляцыя. Асаблівасці пераўтварэння і падачы інфармацыі маніпулятарам. Прыёмы маўленчага маніпулявання. Замоўчванне інфармацыі. Селекцыя інфармацыі. Скажэнне інфармацыі: колькасныя змены, перагортванне інфармацыі. Спосабы падачы інфармацыі: несістэматызаванасць, драбненне, змешванне фактаў, наданне паведамленню характару неадкладнасці, выкарыстанне сенсацый. Група прыёмаў, заснаваная на незахаванні закона дастатковых умоў. Прыёмы, заснаваныя на незахаванні закона тоеснасці. Прыёмы, заснаваныя на незахаванні закона супярэчнасці. Парушэнне пастулату колькасці”. У змест заняткаў уключаецца матэрыял пра сферы і сітуацыі, у якіх мае месца маўленчае маніпуляванне. Разглядаюцца элементы маўленчага ўздзеяння ў навучанні і выхаванні, дзе яно можа адыграваць вельмі важную ролю. Пры разглядзе інструментаў маўленчага ўздзеяння належная ўвага надаецца лінгвістычнаму аспекту. выбару моўных адзінак, сінтаксічных канструкцый у адпаведнасці з камунікатыўнай задачай; засваенню маўленчых формул, характэрных для пэўных рытуальных дзеянняў, аналізу ўдалых узораў і антыпрыкладаў і інш.

Як вучэбная дысцыпліна “Маўленчае ўзаемадзеянне і камунікатыўныя стратэгіі” мае інтэграваны характар і цесна звязана з такімі прадметамі, як культура мовы, стылістыка, рыторыка, псіхалогія, сацыялінгвістыка.

**Заключэнне.** Падрыхтоўку будучага спецыяліста на сучасным этапе развіцця грамадства неабходна ажыццяўляць з улікам рэальных патрэб працадаўцаў. Пераход на практыка-арыентаваны змест навучання ў сістэме вышэйшай адукацыі прадугледжвае ўключэнне ў працэс навучання такіх дысцыплін, якія былі б накіраваны на фарміраванне творчай і крэатыўнай асобы, гатовай рэалізаваць сябе ў новых камунікатыўных умовах. Кваліфікаваны спецыяліст-філолаг, літаратурна-рэдакцыйны супрацоўнік павінен перш за ўсё авалодаць сучанымі алгарытмамі камунікатыўнага мадэлявання, стратэгіямі і тактыкамі інфармавання, усталявання кантакту і самапрэзентацыі, навыкамі рашэння камунікатыўных задач living рознага тыпу. Гэта дазволіць карэктаваць сваю прафесійную траекторыю, быць здольным да самаразвіцця ў прафесійнай дзейнасці.

1. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года. – https://pravo.by/upload/docs/op/C22100683_ 1638392400.pdf.

2. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўная кампетэнцыя як інтэгральная характарыстыка моўнай асобы / С.В. Мартынкевіч // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XV (62) Регион. науч.-практ. конф. – Витебск, 2010. – С. 171–172. – Режим доступа: https://rep.vsu.by/handle/123456789/26006.